# ВОДЗЫЎ НАВУКОВАГА КІРАЎНІКА

кандыдата гістарычных навук, дацэнта Н. В. Анофранка
аб дысертацыі Пышкала Кацярыны Рыгораўны
«Інстытуты саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі ў беларуска-літоўскіх губернях Расійскай імперыі (1772–1860 гг.)», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Пышкала Кацярына Рыгораўна за перыяд засваення адукацыйнай праграмы аспірантуры падрыхтавала дысертацыйную работу на тэму «Інстытуты саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі ў беларуска-літоўскіх губернях Расійскай імперыі (1772–1860 гг.)», зацверджаную Вучоным саветам дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» 27 снежня 2022 г. (пратакол № 13). Дысертацыя рэкамендавана да абароны метадычным семінарам савета па абароне Д. 01.40.01 пры дзяржаўнай навуковай установе «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».

Актуальнасць тэмы дысертацыйнага даследавання абумоўлена адсутнасцю комплексных даследаванняў саслоўнай апекі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг. як у айчыннай, так і ў замежнай гістарыяграфіі. Абраная для даследавання праблема робіць унёсак у развіццё сацыяльна-эканамічнага напрамку ў беларускай гістарычнай навуцы. Яе запатрабаванасць звязана з тым, што для грамадства Беларусі ў складзе Расійскай імперыі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. праблема апекі над сіротамі стаяла востра. Гэта было звязана з дэмаграфічнымі праблемамі эпохі – высокай смяротнасцю дарослага насельніцтва падчас эпідэмій і войнаў, а таксама нізкай працягласцю жыцця.

Прадстаўленая да абароны кваліфікацыйная работа мае завершаны характар і выканана ў адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь да кваліфікацыйных навуковых работ, адпавядае пашпарту спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя, зацверджанаму загадам ВАК Рэспублікі Беларусь ад 01.06.2022 №180, а таксама галіне навукі – гістарычныя.

Саіскальнік вучонай ступені валодае неабходнымі навуковымі кампетэнцыямі для правядзення даследаванняў па айчыннай гісторыі, здольны на высокім узроўні рабіць гістарыяграфічны і крыніцазнаўчы аналіз, а таксама самастойна здзяйсняць тэарэтычныя абагульненні на падставе выяўленага фактычнага матэрыялу. Навуковая кваліфікацыя К. Р. Пышкала адпавядае вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Дысертацыя К. Р. Пышкала з'яўляецца комплексным навуковым даследаваннем, якое робіць значны ўнёсак у сацыяльную гісторыю Беларусі перыяду Расійскай імперыі. У межах падрыхтоўкі даследавання былі зайдзейнічаны фонды айчынных і расійскіх архіваў, што дазволіла ажыццявіць паспяховую рэалізацыю даследчых задач. Высновы і палажэнні дысертацыйнага даследавання заснаваныя на шырокім коле дакументальных крыніц і абапіраюцца на выніки гістарыяграфічнага аналізу, што забяспечвае іх абгрунтаванасць.

Дысертацыя К. Р. Пышкала з'яўляецца першым комплексным даследаваннем станаўлення сферы саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на беларуска-літоўскіх землях у перыяд іх інтэграцыі ў сацыяльна-прававую прастору Расійскай імперыі. Комплексны падыход да праблемы сіроцтва ў саслоўным грамадстве беларуска-літоўскіх губерняў канца XVIII – першай паловы XIX ст. прымяняецца ў айчыннай гістарыяграфіі ўпершыню, асноўная частка дакументальных крыніц ўпершыню ўведзена ў навуковы ўжытак. Цалкам новай у айчыннай гістарыяграфіі з'яўляецца тэматыка дзейнасці дваранскіх апек і сіроцкіх судоў у дачыненні да сірот адпаведных саслоўяў. Таксама ўпершыню разглядаюцца спецыфічныя формы апекі над дзецьмі-сіротамі ў духоўным саслоўі і ў саслоўі сельскіх абывацеляў.

Навуковая значнасць працы складаецца ў тым, што К. Р. Пышкала на падставе шырокага кола крыніц упершыню паказала працэс станаўлення і развіцця саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Высновы і абагульненні дадзенай дысертацыйнай працы могуць стаць падставай для правядзення далейшага навуковага даследавання праблем, закранутых у дысертацыі: разгляд працэсаў станаўлення дзяржаўнага апарата Расійскай імперыі, асобных сфер дзейнасці дзяржаўных інстытутаў (сацыяльная дапамога, адукацыя, дабрачыннасць і г. д.), асаблівасці гэтых працэсаў на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў.

Практычная значнасць палягае ў тым, што атрыманыя выніки могуць быць выкарыстаны пры напісанні навуковых прац па гісторыі Беларусі, пры стварэнні музейных экспазіцый, прысвечаных выхаванню, адукацыі і дабрачыннай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі, а таксама ў навучальным працэсе пры выкладанні курсаў па гісторыі Беларусі, спецыялізаваных курсаў па сацыяльнай гісторыі (у тым ліку гісторыі дзяцінства) Беларусі і гістарычнай антрапалогіі. Матэрыялы дысертацыі знайшлі прымяненне ў практычнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі», пра што сведчыць акт укаранення ад 19.12.2025 № 1.

Асноўныя палажэнні і высновы праведзенага даследавання знайшлі адлюстраванне ў дакладах, прадстаўленых аўтарам на 14 міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях і круглых сталах.

Вынікі дысертацыйнага даследавання апублікаваныя ў 13 навуковых артыкулах, 4 з якіх прадстаўлены ў выданнях, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з п. 19 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь.

Такім чынам, дысертацыйнае даследаванне «Інстытуты саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі ў беларуска-літоўскіх губернях Расійскай імперыі (1772– 1860 гг.)» адпавядае патрабаванням главы 3 «Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь», зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17.11.2004 № 560. Гэта самастойна выкананая кваліфікацыйная навуковая работа, якая мае лагічную структуру, унутранае адзінства, адрозніваецца высокай ступенню навізны і змяшчае навуковыя высновы, якія сведчаць пра ўнёсак К. Р. Пышкала ў вырашэнне важнай навуковай задачы – паказаць станаўленне і развіццё саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг., выявіць яе прававыя асновы, формы і асаблівасці.

З улікам вышэйсказанага, Пышкала Кацярына Рыгораўна заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 за:

– вызначэнне прававых асноў развіцця заканадаўства аб саслоўнай апецы над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг.;

– выяўленне і тыпалагізацыю форм апекі над сіротамі розных саслоўяў: інстытуты апекі для дваран і гарадскіх абывацеляў, карпаратыўная апека ў саслоўі праваслаўнага і ўніяцкага духавенства, традыцыйныя практыкі ў саслоўі сельскіх абывацеляў;

– вылучэнне асаблівасцей у функцыянаванні механізмаў абароны інтарэсаў сірот дваран і гарадскіх абывацеляў, на якія ўплывалі асаблівасці заканадаўства, працэс інтэграцыі вышэйшага саслоўя былой Рэчы Паспалітай у дваранства Расійскай імперыі, этнаканфесійная спецыфіка насельніцтва тэрыторыі Беларусі;

– акрэсленне вынікаў апекі над сіротамі для кожнага з саслоўяў: захаванне маёмасці ў цэласці для дваранскага саслоўя; абарона маёмасці і прафесійная спецыялізацыя для гарадскіх абывацеляў; падтрыманне карпаратыўнай замкнёнасці праваслаўнага і ўніяцкага духавенства дзеля выканання кантралюючых і ідэалагічных функцый у грамадстве; захаванне жыцця і здароўя, а таксама імкненне запаволіць маргіналізацыю для сельскіх абывацеляў;

– адлюстраванне разнастайных практык забеспячэння матэрыяльных, выхаваўчых і адукацыйных патрэб сірот на тэрыторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XIX ст.

Разам з тым, у мэтах прывядзення ў адпаведнасць са зместам ёсць неабходнасць удакладніць назву дысертацыі ў наступнай фармулёўцы: «Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772–1861 гг.)».

Навуковы кіраўнік
вядучы навуковы супрацоўнік
аддзела гісторыі Беларусі
канца XVIII – пачатку XX стагоддзяў
Інстытута гісторыі НАН Беларусі
кандыдат гістарычных навук, дацэнт Н. В. Анофранка

27 студзеня 2026 г.

Подпіс Анофранка Н.В.
Вяд. спецыяліст па кадрах
«27» 01 2026